№ 02 (595)
Студзень 2016 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

## У нумары:

☞ **Досвед**: *вандроўка па зямлі крывічоў* – *стар. 2 і 5*

☞ **Юбілей**: *пружанскі лекар Казімір Пацэвіч* – *стар. 4*

☞ **Выданне**: *«Калевала» выйшла па-беларуску* – *стар. 6*

☞ **Бежанства**: *кніга пра трагічную старонку гісторыі* – *стар. 7*




*Партрэт Ул. Мулявіна мастака Леаніда ШЧАМЯЛЁВА (захоўваецца ў музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры)*

# Сялявіцкая «Сябрына»

Яшчэ ў далёкім 1984 годзе ўпершыню адкрыла дзверы літаратурна-музычная гасцёўня «Сябрына» Сялявіцкай сельскай бібліятэкі Слонімскага раёна. Пра такую «Сябрыну» даўно марылі вяскоўцы. У той час яе ўзначаліў настаўнік мясцовай школы Часлаў Маркушэўскі. Спачатку «Сябрына» ўяўляла сабой клуб па інтарэсах. Вяскоўцы проста хацелі абудзіць землякоў, наладзіць лепшыя стасункі паміж сабой. Затым выбралі форму літаратурна-музычнай гасцёўні, бо палічылі, што літаратура і мастацтва – найтанчэйшы інструмент духоўнага свету чалавека.

І вось гасцёўня існуе больш за 30 гадоў. «У нашай гасцёўні сустракаюцца людзі самых розных прафесіяў – настаўнікі, работнікі сельскай гаспадаркі, пенсіянеры, школьнікі. У нас няма проста слухачоў, выканаўцаў. Кожны ўдзельнік выступае ва ўсіх ролях. Бывае і шумна, бо мы спрачаемся, гутарым, марым. Бывае, што пасля напружанага дня ў нас не адчуваеш стомленасці, а, наадварот, не хочацца развітвацца з аднавяскоўцамі, – распавядае загадчыца Сялявіцкай сельскай бібліятэкі Ірына Каранец. – Прыгадваецца першая сустрэча, што рыхтавалася з асаблівым стараннем і хваляваннем, усё было вельмі прыгожа і ўтульна, з духмянай гарбаткай, з кветкамі на сталах. Усё было аформлена ў беларускім стылі з ручнікамі і сурвэткамі. Мы імкнуліся і імкнемся сёння зрабіць усё магчымае, каб і госці, і ўдзельнікі нашых сустрэчаў і вечароў адчувалі шчырасць і добразычлівасць. Як некалі сказаў наш зямляк паэт, доктар філалагічных навук Мікола Арочка, які неаднаразова бываў нашым госцем, “Сялявіцкая “Сябрына” аказалася бадай ці не самай адмысловай, своеасаблівай, непаўторнай, бо збіраюцца тут розумы і сэрцы са сваіх самых блізкіх і родных людзей”».



*Актывісты «Сябрыны»*

Госцем «Сябрыны» быў не толькі літаратар М. Арочка, але і мясцовыя паэты Анатоль Іверс, Алесь Сучок. Незабыўнымі сталі сустрэчы з піяністкай Ірынай Шумілінай, салісткай Белдзяржфілармоніі Станіславай Гулевіч і піяністкай Таццянай Вішняковай, заслужанай артысткай Беларусі Ганнай Ражковай, спявачкай Надзеяй Мікуліч, протаіерэем Аляксандрам Бароўскім ды іншымі цікавымі і таленавітымі людзьмі.

Папулярнасцю ў наведнікаў «Сябрыны» карыстаюцца літаратурна-музычныя вечарыны, прысвечаныя надзённым тэмам і датам. Гэта мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Маці, Дня сталых людзей, прысвечаныя юбілейным датам паэтаў, кампазітараў, мастакоў.

Паводле словаў вяскоўцаў, іх гасцёўня – сапраўдны дом духоўнага яднання людзей розных прафесіяў, дзе па табе сумуюць, як па родным чалавеку, дзе кожнага чакаюць сябры-аднадумцы, якім ты нясеш сваё сэрца.

*Сяргей ЧЫГРЫН*
*Фота аўтара*



*Госці «Сябрыны» – былы старшыня калгаса Эдуард Арочка і паэт Мікола Арочка*

**Ад рэдакцыі.** *Чытаем гэты невялічкі артыкул і разам са словамі ўдзячнасці людзям, якія працуюць у такіх бібліятэках, як сялявіцкая, ўспамінаецца, што некаторым чыноўнікам прыходзіць у галаву «ідэя» закрыць (як непатрэбныя) амаль палову бібліятэк на сяле. Маўляў, аптымізацыя прымушае. Такая аптымізацыя на сяле – чарговы «выкрунтас» чыноўных асобаў без разумення ролі і задачаў бібліятэк па падтрыманні культурнага ўзроўню насельніцтва, выхаванні моладзі. Ці, можа, гэта камусьці трэба?*

## На тым тыдні...

✓ **4 студзеня** ў Гродне адкрыўся **музей праса.** У экспазіцыі прадстаўлена больш за сотню прасаў, якія цягам двух апошніх дзесяцігоддзяў збіраў гродзенскі калекцыянер Алег Ёрш. Самаму старому экспанату больш за трыста гадоў. Ёсць у музеі і ўнікальны прас для ляўшы, «шынельныя» прасікі з цэльнага кавалка чыгуну, якія масава закупляла Германія, каб абысці забарону на пастаўку металаў. Тут знаходзяцца і іншыя цікавыя рэчы: пральныя машыны, таркі, прылады для расколвання арэхаў. Адкрытая ў музеі і своеасаблівая крамка старызніка, дзе можна набыць старыя рэчы і ўпрыгожанні.

✓ **7 студзеня** ў Віцебску адбыліся **калядныя гулянні «Віцебскія Каляды».** Яны пачаліся з шэсця, у якім удзельнічалі прадстаўнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі «Нагльфар» (вікінгі IX – XI стст.) і «Хальвіль» (рыцары XIV – XV стст.), а потым члены клуба «Паўночная сухадроўка» зладзілі святочнае дзейства з калinjaднымі песнямі, танцамі і карагодамі. Пад час свята можна было пабачыць выстаўку выцінанак, створаных майстрамі Віцебшчыны, і выстаўку дзіцячай творчасці «Казкі Раства», наведаць музычны салон у стылі XIX ст.

✓ **8 студзеня** на базе сялянска-фермерскай гаспадаркі «Люкжына» ў Лепельскім раёне адбыўся **абрад «Жаніцьба Цярэшкі».** Гэтае старадаўняе народнае свята раней адзначалі ў калядныя дні, каб бліжэй пазнаёміць нежанатую моладзь, даць магчымасць прымераць на сябе ролю жанатых людзей. Асноўнае дзеянне ігрышча – падбор сямейных параў – уключае гульнявыя дзеянні, рытуальную імітацыю вянчання і застолля.

✓ **9 студзеня** Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту чакаў наведнікаў на **мерапрыемстве «Спорт, гульні і забавы ў беларускай вёсцы».** Пад час яго можна было пазнаёміцца з унікальным комплексам спартыўных снарадаў XIX ст. на школьным двары народнага вучылішча і даведацца пра фізічнае выхаванне вучняў у школах Мінскай губерні, пагуляць у беларускія зімовыя гульні.

✓ **З 14 па 17 студзеня** ўсе ахвочыя змогуць у Свята-Елісавецінскім манастыры ў Мінску праходзіць **Міжнародны калядны фестываль батлеечных і лялечных спектакляў «Нябёсы»**, у якім удзельнічаюць 19 тэатраў Беларусі, Расіі і Украіны. Акрамя ўдзелу ў конкурснай праграме творчыя калектывы выступяць у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, псіханеўралагічных інтэрнатах і інш. 16 студзеня ўсе ахвочыя змогуць паўдзельнічаць у круглым стале «Батлейка ў прасторы культуры XXI стагоддзя».

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», «Краязнаўчая газета» са смуткам паведамляюць аб смерці 4 студзеня 2016 года **Іосіфа Фаміча Сушко** – заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь, мастацкага кіраўніка заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь – аматарскага ансамбля песні і танца «Спадчына» Маладзечанскага палаца культуры. Выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім, а таксама калектывам ансамбля і палаца культуры.

# Месца сустрэчы – Мастоўшчына

З 9 па 15 лістапада мінулага года ў Мастоўскім раёне праходзіў Тыдзень культуры пад назвай «Культура без межаў». Не засталіся ў баку ад гэтай падзеі і бібліятэкі раёна.

У дзень адкрыцця Тыдня культуры ў літаратурна-музычнай гасцёўні «Натхненне» цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылася сустрэча з сябрамі Саюза пісьменнікаў Беларусі «Гарачы след таленту». Паэты Генадзь Пашкоў, Яна Явіч, Дзмітрый Дземідовіч, Аліна Легастаева, Анатоль Зэкаў чыталі свае вершы, адказвалі на пытанні гледачоў. Пра дзейнасць выдавецтва «Чатыры чвэрці», з якім супрацоўнічае раённая бібліятэка, расказала галоўны менеджар Святлана Франко. Творцы падарылі бібліятэцы свае зборнікі вершаў, а народны калектыў народнай песні «Ярыца» выканаў прыгожыя музычныя кампазіцыі.




*Адкрыццё Тыдня культуры*

Ужо другі раз за гэты год паэты Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык і маладая паэтка Вікторыя Смолка прыехалі ў Масты, каб паўдзельнічаць у мерапрыемстве «Святло роднага слова». Сустрэчу суправаджалі музычныя нумары ў выкананні навучэнцаў Мастоўскай дзіцячай школы мастацтваў. Пад час Тыдня культуры адкрылася і выстаўка-экспазіцыя «Дамам эпохі прысвячаецца...», дзе прадстаўленыя мастацкія кнігі і лялькі ў вобразах гераіняў гэтых кніг.

12 лістапада ў Мастоўскай раённай дзіцячай бібліятэцы школьнікі малодшых класаў сустрэліся з гродзенскай пісьменніцай Таццянай Сучковай, якая піша казкі і вершы для дзяцей. Вельмі спадабаўся гасцям верш «Масты», прысвечаны аўтаркай нашаму гораду. Таксама Т. Сучкова расказала аб сваім пісьменніцкім дэбюце, які адбыўся яшчэ ў школьныя гады, распавядала гісторыі з дзяцінства, чытала свае творы. Напрыканцы аўтарка падарыла бібліятэцы свае кнігі.

Цікавай была і сустрэча з мясцовай паэткай Зінаідай Біліда, што адбылася ў раённай бібліятэцы. Аўтарка чытала свае вершы розных гадоў, а Мастоўскі хор ветэранаў выканаў песні на яе вершы.



*Н. Батракова*

13 лістапада ў раённай дзіцячай бібліятэцы гродзенская крама-клуб «Кубік» правяла прэзентацыю-навучанне інтэлектуальных, лагічных, стратэгічных настольных гульняў для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, для падлеткаў і ўсёй сям'і.

У заключны дзень Тыдня культуры адбылася сустрэча з беларускай пісьменніцай Наталляй Батраковай, аўтаркай раманаў «Территория души», «Площадь согласия», «Миг бесконечности», а таксама некалькіх вершаваных зборнікаў. Падарункам для прысутных сталі выкананыя Н. Батраковай песні на свае вершы, якія паклаў на музыку кампазітар Сяргей Сухамлін.

Тыдзень культуры на Мастоўшчыне даў жыхарам рэгіёна выдатную магчымасць дакрануцца да прыгожага пісьменства, паўдзельнічаць у сустрэчах з цікавымі і выбітнымі людзьмі краіны.

*Надзея НАВАГРОДСКАЯ,*
*загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Мастоўскай раённай бібліятэкі*

***Наш даўні чытач і аўтар Ігар Пракаповіч, які працуе настаўнікам ў Паставах, даслаў цыкл артыкулаў пра нядаўнія вандроўкі, што правёў з сябрамі апошнім часам. Вядомы краязнаўца дзеліцца сваімі знаходкамі і досведам радзімазнаўчых падарожжаў. З сённяшняга нумара пачынаем знаёміць чытачоў газеты з яго нататкамі.***

# Падарожжа па зямлі крывічоў

Група краязнаўцаў і сяброў пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны 14 жніўня здзейсніла аўтавандроўку па цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частках Мядзельскага раёна. Мэтамі паездкі былі сустрэчы з цікавымі людзьмі, наведванне школаў, музеяў, храмаў і іншых мясцовых установаў, збор краязнаўчых матэрыялаў.

Першым населеным пунктам на нашым шляху была невялічкая вёска Шкленікава – адно са старэйшых паселішчаў Мядзельшчыны, цэнтр былой Скленікаўскай воласці. У яго ваколіцах ёсць шэраг цікавых прыродных і гістарычных аб'ектаў: азярцо пры дарозе Сваткі – Мядзел, якое, як лічаць некаторыя даследчыкі, мае метэарытнае паходжанне; вялікая колькасць валуноў, сярод якіх вылучаецца Чортаў камень (больш за 4 метры даўжынёю; дарэчы, ён ляжыць пасярод поля, і ўдзельнікам вандроўкі давядзілася праходзіць па збажыне); мясцовыя могілкі, дзе захавалася шмат даўніх пахаванняў, пра якія сведчаць заімшэлыя камяні; помнік загінулым землякам і падмурак пачатковай школы, у якой вучыўся Максім Танк. У вёсцы нас чакала сустрэча з народным майстрам, разьбяром па дрэве Міхасём Чарняўскім, які займаецца вырабам сувенірных кубкаў, дэкаратыўных рамак для люстэркаў і карцінаў ды іншых цікавых рэчаў з дрэва. Ён, філолаг па адукацыі, пакрысе збірае матэрыялы пра родную вёску і яе ваколіцы.




*М. Чарняўскі і І. Пракаповіч*

Наступны пункт паездкі – аграгарадок Сваткі, дзе па папярэдняй дамоўленасці нас ужо чакалі ў мясцовай школе. Сама школа пакінула вельмі прыемнае ўражанне сваёй дагледжанасцю і чысцінёй, але найбольш уразілі дзве камеры знешняга назірання, якія не ў кожнай гарадской школе ёсць, і музей Максіма Танка. У Сватках наш славуты паэт вучыўся, таму варта выказаць словы глыбокай павагі вучням і педагагічнаму калектыву, якія сабралі матэрыялы і аздобілі музейную экспазіцыю. Увагу прыцягваюць тэматычныя раздзелы «Літаратурная карта Мядзельскага раёна», «Радавод Максіма Танка», «Сялянская хата», кампазіцыя па кнігах паэта. Паводле словаў настаўнікаў, у Сватках жыве шмат творчых людзей, сярод якіх выдзяляюцца майстар на ўсе рукі Ірына Чараповіч і былы настаўнік гісторыі, а цяпер майстар-каваль, удзельнік гістарычных рэканструкцыяў Мікалай Малько. На жаль, з гэтымі людзьмі сустрэцца нам не ўдалося. Адметным аб'ектам аграгарадка з'яўляецца мураваная брама і некалькі помнікаў на месцы былой мясцовай царквы.

(Заканчэнне на стар. 5)

## Мусульманскія святы

Мусульмане адзначаюць свае святы паводле месяцовага ісламскага календара, дзе1-ы год – 622-і (Хіджра) паводле грыгарыянскага; складаецца з 12-і месяцовых месяцаў, год мае прыкладна 354 дні (на 10 або 11 дзён меней як сонечны). Усе мусульмане традыцыйна святкуюць 2 галоўныя святы: свята разгавення і свята ахвярапрынашэння.

*Заўвага: даты календара могуць змяніцца ў залежнасці ад стану месяца.*

**14 красавіка** – Лайлат-уль-Рагаіб (ноч Рагаіб; ноч надзеі)
**3 мая** – ноч Мірадж (узнясенне Прарока Мухамеда)
**21 мая** – Лайлят-уль-Бараат (Свяшчэнная ноч Бараат)
**6 чэрвеня** – Рамадан (пачатак посту)
**3 ліпеня** – Ляйлят уль-кадр (ноч магутнасці й пераадолення)
**6 ліпеня** – Ураза-Байрам (Ід аль-фітр, Рамадан-Байрам; свята сканчэння посту, у час якога быў ніспасланы Кур'ан)
**3 верасня** – пачатак месяца Зуль-хіджа (адзін з месяцаў забаронаў)
**11 верасня** – Дзень Арафат (апошні дзень хаджу; да заходу сонца вернікі стаяць і замольваюць грахі)
**12 верасня** – Курбан-Байрам (свята ахвярапрынашэння)
**13 верасня** – дні Ат-Ташрык (працяг свята Курбан-Байрам)
**3 кастрычніка** – Новы год па Хіджры
**12 кастрычніка** – Дзень Ашура (дзень памінання пракрокаў пасланнікаў Алаха)
**1 лістапада** – пачатак месяца Сафар (месяца рытуалаў і спакою)
**27 лістапада** – Ноч Хіджры (ноч перасялення Прарока з Мекі ў Медыну)
**12 снежня** – Маўлід ан-Набі (нараджэнне Прарока Мухамеда)

## Іудзейскія святы

Гэта асабліва шанаваныя дні, што адзначаюцца паводле пэўнага рытуалу вернікамі. Паслядоўнасць звязаная з яўрэйскім календаром. Адпаведна яго, звычайны (невісакосны) год мае 354 дні, аб'яднаныя ў 12 месяцаў па 29 і 30 дзён. Каляндар мае 19-гадовы цыкл: да 7 гадоў з 19-і дадаецца яшчэ 1 месяц. Усе святы пачынаюцца з заходу сонца папярэдняга дня. Большасць іудзейскіх святаў звязаная з падзеямі яўрэйскай гісторыі.

**25 студзеня** – Ту-бі-Шват (Новы год дрэваў)
**24 сакавіка** – Пурым
**23 – 30 красавіка** – Песах (Пасха)
**5 мая** – Ём а-Шаа (Дзень памяці ахвяраў Халакоста)
**11 мая** – Дзень памяці загінулых у войнах Ізраіля
**26 мая** – Лаг ба-омер (Свята пікнікоў, вогнішчаў і забаваў)
**12 чэрвеня** – Шаўот
**23 ліпеня** – пост 17 Тамуза
**14 жніўня** – пост 9 Ава
**3 – 4 кастрычніка** – Рош ха-Шана (Новы год)
**6 кастрычніка** – пост Гедаліі
**12 кастрычніка** – Ём Кіпур (Судны дзень, Дзень збавення і ўсёдаравання)
**17 – 23 кастрычніка** – Сукот (Свята буданоў; звязаны са святам заканчэння збору ўраджаю)
**24 кастрычніка** – Сімхат Тора (Свята даравання Торы; заканчваецца гадавы цыкл чытання Торы і адразу ж пачынаецца новы)
**25 снежня – 1 студзеня 2017 г.** – Ханука

# «Калядны фэст»:
## змест традыцыйны – кантэкст сучасны



***Вядома, што на Каляды ў беларускіх вёсках праходзілі малебны ў гонар Божага Нараджэння, ладзіліся калядкі са «звездаром», Казой ды іншымі пераапранутымі персанажамі, а таксама – святочныя батлейкі, у якіх распавядалася біблейская гісторыя нараджэння Збаўцы. А ў хаце ўсіх чакала святочная малітва і вячэра з каляднымі прысмакамі... Добра, што Каляды і цяпер застаюцца адным з самых чаканых і запамінальных святаў беларусаў. Хоць і формы яго святкавання часцяком набываюць не зусім звычайнае ўвасабленне.***

***Адным з прыкладаў сучаснага падыходу да святкавання Калядаў стала беларускае шоу «Калядны фэст – 2015», што адбылося ў сталічным клубе «Re:Public». Тут гучалі рэлігійныя спевы, калядкі ў сучасных апрацоўках, адбывалася тэатралізаваная святочная дзея, а моладзь скакала і кружылася ў карагодах...***

Слухачоў, якія прыйшлі на Каляды на гэтае шоу, ад самага пачатку прывіталі знакамітым калядным спевам «Jingle Bells» дуэт шатландскіх дудаў (хайлэндаў) «PiobROCK» у складзе Аксаны і Андрэя Марозаў. Дарэчы, вядучы фэсту Зміцер Сасноўскі зазначыў, што паводле ягоных звестак, у Слуцку жылі блізу 4 тысячаў эмігрантаў з Шатландыі, якія і прывезлі з сабою гэты інструмент. Таму хайлэнд – не чужы і для беларускай культуры. Яго яскравы і запамінальны гук не мог не крануць сэрцы слухачоў, якія шчыра віталі выканаўцаў. Тым больш, што А. Мароз – беларус з Новай Зеландыі – выдатна размаўляе на роднай мове!

Неа-фолк-гурт «Irdorath» з Гродна, які выйшаў на сцэну наступным, набыў сапраўдны сімфанічны склад: да дзвюх нямецкіх дудаў (дудэльзакаў), дзвюх ударных установак, клавішных дадаліся скрыпка, колавая ліра, акустычная гітара, экзатычны дзіджэрыду, вакальная і танцавальная групы. Ад гэтага гучанне і шоу «Irdorath» стала яшчэ больш



«PiobROCK» распачаў фэст мелодыяй «Jingle Bells»

насычаным і дынамічным. Але слухачы асабліва шчыра віталі музыкаў, калі тыя выканалі кампазіцыю на верш класіка беларускай літаратуры У. Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду».

Наступны ўдзельнік гурт «Стары Ольса» павіншаваў слухачоў з Калядамі гімнам Божаму Нараджэнню «Заспявай адзінай Панне» («Ave, Maria!»). Гэты твор дадаў святочнага каляднага настрою слухачам, якія спявалі разам з музыкамі і іншыя тэксты твораў гурта, – «Песню а князю Вітаўце», «Ліцвін», услухоўваліся ў кампазіцыі знакамітага «Полацкага сшытка». Ну а калі быў аб'яўлены інструментальны нумар «Drumul Draculi», то надышоў «зорны час» вандроўнага тэатрыка «Гістрыён», удзельнікі якога вучылі маладых хлопцаў і дзяўчатаў сярэднявечным танцам, а таксама прадстаўлялі калядную дзею з Казой, Мядзведзем і калядоўшчыкамі. Было весела і спазнаваўча, бо такое пабачыць можна не паўсюль. Гэта і выклікала захапленне слухачоў і шчырыя апладысменты музычнай Калядзе ад «Старога Ольсы» і «Гістрыёна».

Наступны ўдзельнік фэсту гурт «Trollwald» – новы праект дудара і вакаліста Андрэя Апановіча, што ўзнік у выніку зменаў у складзе папярэдняга праекта музыкі, – гурта «Litwintroll». Усім аматарам экстрэмальнага напрамку ў беларускай фолк-рок-музыцы хацелася, каб традыцыі папярэднікаў гуртом «Trollwald» былі захаваныя і памножаныя. Ці спраўдзіліся іх надзеі? Думаю, так, хоць і да новых музычных рэаліяў у «Trollwald» ім трэба будзе прызвычаіцца: у кампазіцыях новага гурта стала менш выкарыстоўвацца дудаў, хоць народныя духавыя інстументы – дудкі, шалмеі ў аранжыроўках прысутнічаюць. На іх грае ўдзельнік гурта «Стары Ольса» Алесь Чумакоў. У цэлым жа «Trollwald» можа годна працягваць традыцыю «беларускіх музычных троляў», як і іх альтэр-эга, што ўзнік на аскепках «Litwintroll», – гурт «Sakramant».

Па-святочнаму, аптымістычна прагучала калядная праграма фолк-мадэрн-гурта «Палац». Гэта выявілася, калі гучалі іх лепшыя апрацоўкі: «Каляда-калядзец», «Кола грукатала», «Дзеўка-сямілетка», «Канюшня» і шмат іншых кампазіцыяў паводле беларускага фальклору. Дзякуючы прафесіяналізму музыкантаў, мяккаму гумару лідара гурта Алега Хаменкі, удзельнікі «Палаца» з першых жа нотаў знайшлі кантакт са слухачамі, захапілі моладзь фальклорнымі мелодыямі.

«Калядны фэст – 2015» завяршаў хэдлайнер гэтага музычнага свята – гурт «Znich». Пра новы этап у творчасці гэтай легендарнай pagan-metal-каманды загаварылі пасля запісу і прэзентацыі іх новага сінгла «Дунаю». Гэтая апрацоўка прагучала і на калядным канцэрце. Дзякуючы дудару гурта Кастусю Трамбіцкаму і вакалісту Алесю Таболічу твор набыў закладзены ў яго змест драматызм і экспрэсію. І хоць слухачы ўжо былі стомленыя калядным марафонам, але яны з прыязнасцю і энтузіязмам сустрэлі й іншыя кампазіцыі гурта «Znich». Прагучалі такія хіты, як «Ярыла», «Мроя», «Адвечны край», «Беларусь»...

***Пасля дзесяцігоддзяў адлучэння ад нацыянальных і рэлігійных традыцыяў, у краіне высілкамі энтузіястаў – этнографаў, краязнаўцаў і студэнтаў мастацкіх ВНУ – адраджаюцца Каляды як усебеларуская культурніцкая з'ява. Гэты працэс шматгранны: на вёсцы – больш увагі надаецца адраджэнню спракавечных традыцыйных Калядаў, а ў горадзе шукаюць і выкарыстоўваюць авангардныя сродкі для прыцягнення ўвагі моладзі да народных традыцыяў. Бывае, што гэтыя лініі ў працэсе адраджэння нацыянальных культурных каштоўнасцяў перасякаюцца. І ў працэсе іх сінтэзу нараджаюцца новыя формы, новая эстэтыка беларускай культуры XXI стагоддзя.***



Салістка «Irdorath» Надзея



А. Апановіч



А. Таболіч

*Анатоль МЯЛЬГУЙ, фота аўтара*

# «Генавы гены»: феномен творчасці Хацкевічаў

***18 снежня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі) адкрылася выстаўка «Генавы гены» вядомага беларускага мастака Генадзя Хацкевіча (1952 – 2014), а такса-ма яго дзяцей Аляксея і Мадлен і ўнукаў Ганны і Пятра.***



*Г. Хацкевіч, «Пра каханне» (2005–2007 гг.)*



*Л. Фінкельштэйн (злева) з мастаком А. Хацкевічам і яго дзецьмі*

Аўтарам праекта выступіў сын мастака Аляксей, прысвяціўшы яго свайму знакамітаму бацьку – легендзе беларускага авангарда, аднаму з самых экстравагантных прадстаўнікоў выяўленчага мастацтва Беларусі, чыя творчасць ніколі не пакідае абыякавым.

Г. Хацкевіч скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (цяпер Мінскі мастацкі каледж імя А.К. Глебава), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), дзе навучаўся на аддзяленні манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў выдатнага майстра Гаўрылы Вашчанкі.

Творчая біяграфія мастака пабудаваная на кантрастах навакольнага асяроддзя, робіць зігзагі і стромкія павароты на кожным кроку творцы. Усе гэтыя жыццёвыя перыпетыі адбіліся на яго палотнах з багатымі і разнастайнымі сюжэтамі. Сам Г. Хацкевіч меркаваў, што яго карціны заснаваныя на тэхналагічных і навуковых адкрыццях. Працы мастака знаходзяцца ў музеях, галерэях і прыватных зборах Беларусі, Расіі, Францыі, Германіі, Нідэрландаў, Вялікабрытаніі, ЗША.

На выстаўцы прадстаўленыя розныя перыяды творчасці мастака.

Свае творы таксама выставілі сын А. Хацкевіч (выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Школы мастацтваў Масана, што ў Барселоне, сябра Беларускага саюза мастакоў), дачка М. Хацкевіч (адзін з самых запатрабаваных дызайнераў адзення ў Парыжы), унукі Ганна і Пётр, якія ідуць па слядах сваіх унікальных сваякоў.

Куратар выстаўкі – мастацтвазнаўца, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, сябра Беларускага саюза мастакоў, арт-дырэктар аўтарскай некамерцыйнай канцэптуальнай галерэі «Брама» Ларыса Фінкельштэйн.

*Павел САПОЦЬКА,*
*фота*
*Кацярыны АЛЯКСЕЕВАЙ*

# Ад Пружанаў да Альбіёна

## *Да 120-годдзя з дня нараджэння Казіміра Пацэвіча*

***Не было дня, каб, ідучы на працу каля помніка спаленым вёскам, я не падумала б пра незвычайнага чалавека – Аўгустына Пацэвіча, вядомага ў пачатку XX ст. на ўсю губерню пружанскага лекара, які бясплатна дапамагаў усім, хто не мог заплаціць за лячэнне, і на свае грошы купляў беднякам лекі. І гэта нягледзячы на тое, што ў самога Пацэвіча была вялікая сям'я, і каб пракарміць яе, даводзілася працаваць у некалькіх месцах.***

Хата лекара размяшчалася недалёка ад палацыка, уладальнікі якога Валенцій і Герміння Швыкоўскія (хросныя Аўгустына) і падарылі, паводле ўспамінаў старажылаў, участак ягонай сям'і. Дарэчы, нядоўгі час, з 1926 па 1942 г., вуліца Савецкая насіла імя Пацэвіча.

Мяне заўсёды цікавіла, што стала з яго дзецьмі, бо ж XX ст. унесла страшныя карэктывы ў жыццё. Ці выжыў хто ў горне дзвюх сусветных войнаў? Ці працягнуў хто дынастыю лекараў?

І вось пра аднаго з дзяцей А. Пацэвіча я выпадкова даведалася. Рыхтуючыся да чарговай выстаўкі ў музеі і шукаючы матэрыялы пра польскага скульптара Кшыштафа Градзіцкага, ураджэнца г. Седльцы (Мазавецкае ваяводства), зацікавіліся тым, што ў Сядлецкім рэгіянальным музеі выстаўляецца калекцыя карцінаў мастака Казіміра Пацэвіча. Як высветлілася – аднаго з сямі дзяцей А. Пацэвіча і Сафіі Галоўні.

Вядома пра яго няшмат. Казімір нарадзіўся 22 лістапада 1895 г. у Пружанах, вучыўся паехаў у Гродна, у прэстыжную гімназію. Пасля яе закрыцця працягнуў вучобу ў Брэсцкай гандлёвай вучэльні, па сканчэнні якой паступіў у Маскоўскі гандлёвы інстытут. У 1915 г. сям'я Пацэвічаў эвакуявалася ў Пецярбург, дзе перажыла вайну і рэвалюцыю. У галодным 1918-м Пацэвічы вярнуліся ў родны горад, але без Казіміра.

Ён быў прызваны ў рускую армію і пасля заканчэння Міхайлаўскай акадэміі артылерыі ў Санкт-Пецярбургу размеркаваны ў артылерыйскія войскі. У студзені 1918 г. далучыўся да І Польскага корпуса, дзе служыў камандзірам 2-й брыгады артылерыі. Калі корпус расфармавалі, служыў камендантам разведвальнага аддзялення палка ўланаў Польскай вайсковай арганізацыі ва Усходняй Галіцыі. У бітве пры Бродах быў паранены, пасля рэабілітацыі вярнуўся ў артылерыю. З 1921 г. служыў у Кракаве ў 5-й эскадрыллі, ужо ў званні капітана. У гэты ж час вучыўся ў Кракаўскай акадэміі выяўленчага мастацтва пад кіраўніцтвам майстроў Ігнацыя Пянькоўскага і Юзафа Панкевіча. У 1922 г. узяў шлюб з Соф'яй Голуб, чэмпіёнкай Польшчы сярод жанчынаў-лыжніцаў (1920).



*К. Пацэвіч*

Пасля вучобы ў акадэміі ў 1925 г. К. Пацэвіч быў пераведзены ў запас і, атрымаўшы поўную свабоду, у снежні разам з іншымі вучнямі Панкевіча выправіўся ў Парыж, каб працягнуць вучобу ў лепшых еўрапейскіх майстроў – насельнікаў Манмартра. Прабыўшы там два гады, з-за хваробы жонкі вымушаны быў вярнуцца ў Польшчу.

Але з 1930 г. ён зноў у Парыжы. Быў абраны сябрам аргкамітэта «Таварыства польскіх мастакоў у Парыжы» і арганізаваў шэраг выставак у Салоне незалежных мастацтваў і Салоне Цюільры. Пазней, у 1938 г., выстаўляе свае працы ў Амстэрдаме, у знакамітай галерэі Санта-Ландвер.

Другая сусветная вайна прымусіла Пацэвіча рэзка змяніць усе планы. Ён добраахвотна ўступае ў войска, але ў 1940 г., перад акупацыяй Парыжа, з'язджае з жонкай у Вялікабрытанію. Яго карціны, што засталіся ў Парыжы, ратуе ад загубы і перавозіць у Англію сяброўка сям'і Наталля Бакуніна. У выгнанні мастак за кароткі час піша 30 плакатаў для альбома «Польскія войскі на працягу стагоддзяў», які быў выдадзены ўжо ў 1944 г. У пасляваенны час выкладае ў Школе прыгожых мастацтваў у г. Рэдынг (каля Лондана), выстаўляе свае працы ў мясцовых галерэях. Апошняя прыжыццёвая выстаўка мастака адбылася ў Лондане ў 1974 г.

К. Пацэвіч памёр у польскім шпіталі ў Пэнлі (Уэльс, Вялікабрытанія) 15 жніўня 1974 г. і быў пахаваны на могілках у лонданскім прадмесці Ганэрзбэры. Пасля смерці мужа С. Пацэвіч ахвяравала дзясяткі карцінаў мастака Нацыянальнаму мастацкаму музею ў Варшаве, Чэнстахоўскаму мастацкаму музею і інш. Але самая значная калекцыя карцінаў Пацэвіча – больш за 70 працаў – захоўваецца ў фондах Рэгіянальнага музея ў Седльце. Больш за ўсё ў калекцыі пейзажаў, але ёсць і партрэты, сюжэтна-побытавыя і жанравыя сцэны. Карцінам уласцівы стрыманы каларыт, выпрацаваны пад уплывам непрыветлівага клімату туманнага Альбіёна: халодныя адценні і дробны, перысты, брусісты мазок, які нібы імітуе водбліскі Паўночнага Ззяння.

Даследаваннем творчасці К. Пацэвіча займалася яго пляменніца, мастацтвазнаўца Сафія Разанава (пайшла з жыцця летась у маі). У 2013 г. сядлецкі музей ладзіў маштабную выстаўку твораў К. Пацэвіча, залетась эстафету пераняў музей ў Чанстахове. Спадзяемся, што калі-небудзь атрымаецца прывезці творы мастака і на яго радзіму, у Пружаны.

*Алена ЗЯЛЕВІЧ,*
*старшы навуковы*
*супрацоўнік музея-сядзібы*
*«Пружанскі палацык»*





*Карціны К. Пацэвіча «Сабор Святога Марка» і «Зімовы горны пейзаж»*

# Падарожжа па зямлі крывічоў

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 2)*

Наступны прыпынак – вёска Гарадзішча. Назва дакладна адлюстроўвае яе галоўную адметнасць: каля паселішча ўзвышаецца старажытнае гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі і банцараўскай культуры, якое грунтоўна вывучаў археолаг А. Мітрафанаў. На вясковых могілках пахаваны шчыры беларускі патрыёт, настаўнік Мікола Пашкевіч. Ён выступаў у перыёдыцы з вершамі, літаратуразнаўчымі артыкуламі, кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры газеце «Нарачанская зара», быў аўтарам першай у Беларусі кніжкі «З вопыту работы літаратурнага гуртка» (1968), у пасяджэннях якога прымалі ўдзел Максім Танк, Я. Брыль, В. Быкаў, Н. Гілевіч, У. Караткевіч, Р. Барадулін і іншыя. Памяці М. Пашкевіча В. Быкаў прысвяціў аповесць «Абеліск», А. Лойка – верш «Каліны», мастак А. Пупко – карціну «Памяць». На помніку можна пабачыць словы М. Багдановіча «Светлы след будзе вечна жывы».




*Помнік на магіле М. Пашкевіча*

Пасля Гарадзішча група зрабіла невялікі прыпынак каля вёскі Конікі, дзе агледзела даўнія мясцовыя могілкі, што знаходзяцца ў лесе. На іх пахаваныя цэлыя роды Пуняў, Клімовічаў, Падбярэзскіх, Рапановічаў. Дарэчы, з роду апошніх паходзіць ураджэнец суседняй вёскі Холма, шчыры руплівец на ніве беларушчыны, мовазнаўца, пісьменнік, педагог Яўген Рапановіч. Галоўнай справай яго жыцця стала ўкладанне шасцітомнага «Слоўніка назваў населеных пунктаў» усіх абласцей Беларусі, які не страціў каштоўнасці і да сёння.

Наступным пунктам падарожжа была вёска Выгалавічы, якую наведваў калісьці ў дзяцінстве і аб якой у памяці засталіся гразь на вуліцах ды паваленыя платы. Цяпер, пасля дрогкай і пыльнай жвіроўкі ад Конікаў, паселішча прыемна ўразіла: чысціня, дагледжанасць і новы асфальт на ўсіх вуліцах. Толькі на выездзе ў бок Княгініна дарога шматкроць лепленая-перапепленая. Дарэчы, каля яе захаваўся сімвалічны знак з выявай пеўня. Гэта нездарма: у вёсцы яшчэ нядаўна дзейнічала птушкафабрыка, якая «грымела» на ўвесь рэгіён, і купляць курэй сюды прыязджалі з усіх суседніх раёнаў. Аднак цяпер «грому» няма, прадпрыемства закрытае, шмат людзей засталося без працы. Гэта выклікала ланцужковую рэакцыю: спыніла дзейнасць школа, цяпер, як кажуць мясцовыя жыхары, закрываецца ФАП. Міжволі ўзнікае пытанне: можа, гэта такая палітыка? Спачатку разбураецца эканамічная аснова беларускіх мястэчак і вёсак, затым «перакрываецца кісларод» нацыянальным школам, сядзячым садкам, установам культуры. Мясцовыя жыхары падаюцца ў свет у пошуках лепшай долі, а на іх месца прыязджаюць маргіналізаваныя «перакаці-поле» ці дачнікі, якія адгароджваюцца ад суседзяў высокімі платамі і бавяць час у сваёй «зоне», далёкія ад тутэйшых традыцыяў, мовы, культуры. А «кінутае» прадпрыемства за бесцань выкупляе небеларускі інвестар, і працэс далейшай дэнацыяналізацыі краю ідзе ўжо сам па сабе...

Наступны населены пункт на нашым шляху – аграгарадок Княгінін. Дарэчы, на Мядзельшчыне гэтае мястэчка раней называлі мякчэй і распеўней – Княгініна, як і Мядзела, Свіра, Нароча. У Максіма Танка ёсць верш «Станцыя Княгініна». Чамусьці ў афіцыйную назву ўвялі кальку з рускай або польскай моваў, а не з мясцовага вымаўлення. Здаецца, дробязь, адна літарка, а мова бяднее...

У Княгінінскай школе нас чакала ветлівая і прыязная дырэктарка, якая ўжо папярэдне дамовілася з былой настаўніцай – найбольш дасведчанай жыхаркай мястэчка – аб магчымай сустрэчы з намі. У школе тым часам ішоў рамонт – дабудоўваўся харчблок. Варта адзначыць, што некалькі гадоў таму школу меліся закрыць, бо яна пабудаваная ў 1955 годзе і не адпавядае сучасным патрабаванням. Між іншым, узведзеная яна на падмурку былога сядзібнага дома Козел-Паклеўскіх, які ў вайну спалілі партызаны. Школу, аднак, не закрылі, бо мясцовыя жыхары згуртаваліся і супольнымі намаганнямі яе адстаялі. Будынак знаходзіцца ў прыгожым месцы на ўзгорку, перад ім – стаў і рэшткі былога парку.



*Стары млын на рацэ Наква*

Наступная сустрэча адбылася на хутары Будзькаў. Каля яго знаходзіцца помнік на магіле паўстанцаў 1863 года, які даглядае гаспадыня гэтай сядзібы Ірына Будзька (Клямяціч). Яе бацька пры Польшчы быў у Амерыцы, зарабіў грошы і купіў тут зямлю. Побач купіў зямлю Герасімовіч. Паставілі гаспадары тут хаты, якія сёння ўжо можна ўспрымаць як помнікі, што перажылі шматлікія калектывізацыі, меліярацыі, рэарганізацыі і іншыя «-ацыі», але захавалі сваю адметнасць. Спадарыня Ірына аказалася шчырай і адкрытай жанчынай, з якой лёгка і цікава было весці гутарку. Яна паказала багаты архіў сваіх фотаздымкаў, сярод якіх ёсць карткі міжваеннага і пасляваеннага часу, партрэты «амерыканцаў» – нашых хлопцаў, якія працавалі ў Амерыцы. А крыж на магіле паўстанцаў варта было б занесці ў рэестр нацыянальнай спадчыны і ўзяць пад ахову дзяржавы.




*Мемарыял польскім жаўнерам*

Зрабіўшы фотаздымкі княгінінскай царквы і помніка на магіле 2 500 рускіх салдатаў, якія загінулі на фронце Першай сусветнай вайны, мы накіраваліся ў Крывічы. Праехалі каля адметнага прадпрыемства – газанапаўняльнай станцыі. Па словах мясцовых жыхароў, станцыя перажывае часы заняпаду, і яе рыхтуецца выкупіць расійскі інвестар. Што ж, месца для бізнесу амаль ідэальнае: чыгунка, шаша, гатовая інфраструктура...



*Княгінінская царква*



*І. Будзька*

У Крывічах удзельнікі вандроўкі агледзелі стары млын на рацэ Наква; могілкі з пахаваннямі мясцовых жыхароў, роду Козел-Паклеўскіх і мемарыялам польскім жаўнерам, якія загінулі ў баях супраць бальшавікоў у 1920 годзе; касцёл і кляштар трынітарыяў, дзе зараз вядуцца рэстаўрацыйныя працы; царкву; яўрэйскія могілкі; былую сядзібу ўладальнікаў мястэчка Ходзькаў-Швайкоўскіх. Адбыліся цікавыя сустрэчы ў школе, бібліятэцы, у царкве і на вуліцах з мясцічамі. Так, у школе настаўніца гісторыі Ала Ермаковіч расказала пра некаторыя адметнасці былога мястэчка, пазнаёміла з экспанатамі невялікага краязнаўчага куточка, у якім ёсць шэраг цікавых рэчаў, вартых увагі даследчыкаў нашай даўніны. Па яе словах, вучні і настаўнікі вядуць пошукавую працу ў асноўным па тэме Другой сусветнай вайны, нядаўна выявілі месца, дзе фашысты расстралялі сям'ю мясцовага рабіна.

Шмат тэматычных папак пра Крывічы сабрана ў пасялковай бібліятэцы, загадчыца якой Ала Гурло захоплена і эмацыйна расказвала пра людзей, падзеі і адметныя мясціны. І ў школе, і ў бібліятэцы мы пакінулі буклеты і матэрыялы з планам збору матэрыялаў і напісання кніг пра паселішчы. Крывічы вартыя таго, каб пра іх хтосьці падрыхтаваў грунтоўнае выданне.

Пра гісторыю царквы распавёў нам яе настаяцель айцец Мікалай.

Апошняя сустрэча гэтага дня адбылася на месцы былой сядзібы Ходзькаў-Швайкоўскіх – колішніх уласнікаў мястэчка. Ад былога сядзібнапаркавага ансамбля засталася частка перарobленага жылога будынка, паўразбураны склеп і некалькі старых дрэваў. Цікавай інфармацыяй падзяліўся з намі тутэйшы жыхар Анатоль Адамовіч.

***Пад час паездкі было шмат цікавых сустрэчаў і знаёмстваў, зроблена вялікая колькасць фотаздымкаў, сабраны багаты краязнаўчы матэрыял.***

*Ігар ПРАКАПОВІЧ*

# «Калевала» – цяпер і па-беларуску!

***10 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя беларускамоўнага выдання фінскага нацыянальнага эпасу «Калевала».***

Пераклад зроблены з фінскай мовы з выдання 1922 г. беларускім лінгвістам Якубам Лапаткам, які з 1993 г. жыве ў Хельсінкі. Пяцьдзясят рунаў, складзеныя з 22 795 радкоў эпічнага чатырохстопнага харэя (так званага «калевальскага харэя»), занялі 600 кніжных старонак.

Рэдактар перакладу Лявон Баршчэўскі. У якасці ілюстрацыяў выкарыстаныя 12 рэпрадукцыяў алейных, тэмперных і акварэльных твораў канца XIX – пачатку XX стст. знакамітага фінскага мастака Аксэлі Галена-Калелы, што знаходзяцца ў мастацкіх музеях Фінляндыі. Тэкст перакладу дапоўнены тлумачальным слоўнікам некаторых імёнаў і назваў, якія сустракаюцца ў эпасе, а таксама кароткім зместам кожнай руны.

У пасляслоўі перакладчык у шэрагу самых выдатных



*Л. Баршчэўскі*



*Я. Лапатка*



*З. Колас*

паэтычных твораў свету «Калевалу» параўноўвае з «Новай зямлёй» Якуба Коласа. Нягледзячы на розніцу ў месцы і часе, гэта – роднасныя творы пра штодзённае жыццё простых людзей ва ўсёй прыгажосці і моцы.

400 асобнікаў беларускамоўнага выдання «Калевалы» пабачылі свет у прыватным выдавецтве Змітра Коласа з дапамогай амбасады Фінляндыі ў Беларусі, дзякуючы якой былі знойдзеныя фундатары: Фінска-беларуская гандлёвая палата, фінска-беларускае прадпрыемства «Лидское пиво», хельсінкскае «Таварыства "Калевалы"» і інш.

Разам з перакладчыкам, выдаўцом і рэдактарам у прэзентацыі бралі ўдзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Фінляндскай Рэспублікі ў Літоўскай Рэспубліцы і Рэспубліцы Беларусь Хары Мякі-Рэйнікa, кіраўнік аддзялення Пасольства Фінляндскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Лаўры Пулола, супрацоўнікі НББ, літаратары, навукоўцы, прадстаўнікі грамадскасці і СМІ.

Б. Святлоў аднёс выданне беларускай «Калевалы» да выбітнага дасягнення нашай культуры, прыкладу плённага міжнароднага партнёрства. Х. Мякі-Рэйніка паведаміў, што ў год 180-гадовага юбілею нацыянальнага эпасу Фінляндыі краіна атрымала ў падарунак пераклад на 61-ю мову – беларускую. З'яўленне «Калевалы» па-беларуску не толькі пашырыць веды нашых суайчыннікаў пра фінскую культуру, эпас павінен натхніць беларусаў на больш глыбокае вывучэнне ўласнай народнай культуры і каранёў роднай мовы – галоўных элементаў кожнай нацыі і дзяржавы.



Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі падзякаваў Фінляндскай амбасадзе за падарунак і назваў «Калевалу» брыльянтам фінскай калекцыі НББ. Падкрэсліўшы значнасць падзеі ў культурным жыцці абедзвюх краінаў, зазначыў, што такія кантакты будуць развівацца і надалей. Праведзеныя першыя кансультацыі па вяртанні ў Беларусь электронных копіяў кніг з бібліятэкі Радзівілаў, што знаходзяцца ў Хельсінкскім універсітэце.

Пад час мерапрыемства ўрывак «Калевалы» па-фінску прачытаў Л. Пулола, прагучала фінская класічная музыка ў выкананні музычнага праекта «Bon voyage» і экспанавалася мастацкая юбілейная выстаўка «"Калевала" вачыма рускіх мастакоў», якую можна было пабачыць у галерэі «Лабірынт» цягам месяца.

*Наталі КУПРЭВІЧ*
*Фота аўтара*

# Вёска на ўскрайку Жлобіншчыны

Вёску Грачухі, што знаходзіцца на тэрыторыі Лукскага сельсавета на самым ускрайку Жлобіншчыны, заснавалі ў пачатку XX стагоддзя перасяленцы з суседніх вёсак – Зялёнага Кража і Дубровы. Насельнікі Грачухаў лічаць, што паходжанне назвы іх вёскі звязанае з грэчкай, якую вырошчвалі тут першыя жыхары. І сапраўды, дыялектнае слова «грэча» азначае грэчневае поле.



*К. Грапава з партрэтамі сваіх братоў-франтавікоў*

Вёска ніколі не была шматлюднай. Паводле перапісаў, у 1940 годзе тут жылі 98 чалавек, у 1959-м – 97. А цяпер засталося ўсяго 7 жыхароў. Як сцвярджаюць мясцовыя старажылы, колькасць двароў у Грачухах за ўсю яе стагадовую гісторыю не перавышала 40. І школа ў вёсцы была толькі пачатковая, яе разбурылі немцы пад час акупацыі. Таму пасля вайны дзеці хадзілі ў школу ў Зялёны Краж.

У вёсцы мірна ўжываліся праваслаўныя і каталікі, якіх было прыкладна пароўну. Гэты канфесійны падзел існуе і сёння, хаця заўважыць яго можна не адразу, хіба толькі бліжэй пазнаёміўшыся з людзьмі ды звярнуўшы ўвагу на старажытныя абразы ў хатах: каталіцкія – бліжэйшыя да мастацкіх карцінаў, праваслаўныя – больш строгія.

Разам са старшынёй Лукскага сельскага выканкама Пятром Альхоўскім мы спачатку завіталі ў госці да Кацярыны Грапавай, 85-гадовай гаспадыні, усё жыццё якой прайшло ў Грачухах. Нарадзілася яна ў звычайнай шматдзетнай сялянскай сям'і. Было гэта за год да таго, як у вёсцы быў створаны калгас, у склад якога ўвайшлі таксама суседнія вёскі Дуброва і Зялёны Краж.

Жылося нялёгка. Але сапраўдныя выпрабаванні былі яшчэ наперадзе, калі пачалася вайна. Амаль усе жыхары Грачухаў, акрамя мужчынаў, якія знаходзіліся ў арміі, апынуліся ў фашысцкім лагеры смерці ў Пінскіх балотах. Трапіла туды і 14-гадовая Кацярына. Але ёй пашчасціла выжыць і вярнуцца дамоў. Жывымі засталіся і пяцёра яе братоў, якія трапілі на фронт: Пётр, Яўстрат, Фёдар, два Сямёны – родны і зводны браты. Сустрэў Перамогу і стрыечны брат Кацярыны Яфрэмаўны – Герой Савецкага Саюза Пракоп Странакоў. Гэтае званне ён атрымаў за праяўлены гераізм пад час фарсіравання Дняпра ў кастрычніку 1943 года. Яго сястра расказвае:

– Пракоп у родныя Грачухі прыязджаў рэдка. Ён быў афіцэрам і застаўся служыць у арміі. Пасля вайны закончыў вышэйшую артылерыйскую школу. Але па стане здароўя ў 41 год у званні маёра быў вымушаны пайсці ў адстаўку. Жыў у Ташкенце, працаваў на заводзе. Памёр у 1961-м, калі яму было ўсяго 44 гады. Мала хто ведаў, што ў яго з вайны было шаснаццаць раненняў. Акрамя зоркі Героя ён быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, многімі медалямі. Кожны раз, калі Пракоп прыязджаў у Грачухі, каб адведаць родных, гэта было святам для ўсёй вёскі. Многія прыходзілі да нас у хату, каб павітацца са знакамітым земляком, потым заставаліся на вячоркі. Клуба ў нашай вёсцы ніколі не было, але сваіх гарманістаў хапала. Добра граў на гэтым інструменце і мой муж Васіль.

Затым мы наведаліся ў госці да Казіміры Маскалёвай. Жанчыне ўжо 87 гадоў, яе жыццё таксама прайшло ў Грачухах. Казіміра Касператаўна ўспамінае:



*І. Маскалёў*

– Нашая сям'я каталіцкая. Да вайны мае бацькі хадзілі маліцца за пяць кіламетраў у вёску Антушы, там быў касцёл. У вайну яны памерлі ад тыфу, які падхапілі ў Пінскіх балотах. Мы, дзеці – я, мае брат і сястра – засталіся сіротамі. Але аднавяскоўцы не далі нам памерці з голаду. Ніхто не глядзеў, каталік ты ці праваслаўны. Усе пасля вайны жылі нібы адна вялікая сям'я…

Казіміра Касператаўна памятае тыя часы, калі ў вёсцы была шматлікая калгасная брыгада, у якой працавала і яна. Працы ў гаспадарцы хапала ўсім. На ўласных падворках чуваць было мыканне кароваў, рохканне свіней, квахтанне курэй. Сёння ўжо не тое. Працаздольных жыхароў амаль не засталося, на падворках пуста. Хіба каля некаторых хатаў можна заўважыць па некалькі курэй, ды яшчэ сын Казіміры Касператаўны, 59-гадовы Іван Маскалёў, трымае трусоў.

Грачуха – адзін з самых аддаленых населеных пунктаў у Лукскім сельскім Савеце. Да цэнтра сельсавета – 11 кіламетраў. За ваколіцамі вёскі пачынаецца ўжо Рагачоўскі раён. Ды толькі той, хто пабыў тут, не скажа, што гэта забыты Богам куток. П. Альхоўскі адзначае:

– Сёння мы не падзяляем нашыя населеныя пункты на перспектыўныя і неперспектыўныя. Гэта тычыцца і Грачухаў. Тут ёсць святло, дарога ў вёску падтрымліваецца ў добрым стане. Сюды ходзяць аўтобусы, па графіку прыязджаюць аўталаўка раённага спажывецкага таварыства і перасоўная пошта. І сама вёска добраўпарадкаваная: тут рэгулярна высякаюцца кусты, знесеныя ўсе пакінутыя хаты, якія знаходзіліся ў аварыйным стане. А зямельныя ўчасткі, на якіх яны стаялі, сельскі выканкам перадае ў распараджэнне мясцовага сельгаспрадпрыемства – адкрытага акцыянернага таварыства «Лукскае».

*Мікалай ШУКАНАЎ*
*Фота Мікалая СЕМЯНЦА*

# Трагічная старонка беларускай гісторыі

***Пра бежанства 1915 года ў беларускй гістарыяграфіі заўсёды пісалася вельмі мала ці ўвогуле згадвалася толькі адным сказам: «Першая сусветная вайна выгнала беларусаў у глыб Расіі...». Вось і ўсё. А бежанства для беларусаў было ашаламляльным узрушэннем, таму што іх сілком выкідвалі з родных гнёздаў і адпраўлялі ў Тамбоўскую, Самарскую, Разанскую, Харкаўскую, Екацярынаслаўскую, Арэнбургскую, Курскую, Калужскую і іншыя губерні Расіі.***

З таго часу прайшло 100 гадоў. І толькі сёння на старонках беларускіх СМІ з'явіліся першыя сур'ёзныя даследаванні пра бежанства 1915 года. Праўда, беларусы Беласточчыны яшчэ ў 2000 годзе выпусцілі першую кнігу «Бежанства 1915 года». У ёй былі апублікаваныя ўспаміны жыхароў сённяшняй Беласточчыны, якія ў 1915 годзе пакінулі месцы свайго жыхарства і былі адпраўленыя ў бежанства ў Расію. Дзякуючы праграмнай радзе беларускага тыднёвіка «Ніва» нядаўна ў Беластоку з'явілася новае выданне «Бежанства 1915 года». Яно дапоўненае новымі ўспамінамі, архіўнымі матэрыяламі і здымкамі. Выданне налічвае 600 старонак. Над ім грунтоўна папрацаваў беларускі журналіст і даследчык нашай гісторыі Віталь Луба з Беластока.

У асноўную частку гэтага ўнікальнага выдання увайшлі ўспаміны пра бежанства, якія друкаваліся на старонках тыднёвіка «Ніва» ў 1958 – 2015 гадах, і неапублікаваныя матэрыялы, сабраныя беларускімі журналістамі і літаратарамі Польшчы, а таксама простымі людзьмі, якія жывуць на Беласточчыне. Дапамаглі ў напісанні кнігі беларускія юнакі і дзяўчаты, якія працавалі




ў летніках «Войшкі-97» і «Грыневічы-98», арганізаваных Беларускім гістарычным таварыствам у Польшчы. Іх даследаванні і запісы ўспамінаў старых людзей былі апублікаваныя ў краязнаўча-культурным часопісе «Бельсці Гостінэць».

Прадмову да кнігі напісаў прафесар Яўген Мірановіч. Даследчык бежанства 1915 года адзначыў, што з былой Заходняй Беларусі выехала тады каля 1 мільёна 400 чалавек. Апусцела найперш Гродзенская губерня, асабліва Беластоцкі, Бельскі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Сакольскі, Пружанскі, Кобрынскі, Ашмянскі, Лідскі і Навагрудскі паветы. Расія на беларусаў зрабіла вялікае ўражанне. У многіх рэгіёнах Расіі беларусаў сустракалі ветліва, бежанцаў адорвалі вопраткай, харчамі, давалі жыллё. Большасць нашых бежанцаў там знаходзіла працу, а дзеці пачалі хадзіць у школы. Але пасля 1917 года Расія раптам стала месцам шалёнага самазнішчэння. *«Шмат хто з беларусаў стаў сведкам, а таксама ўдзельнікам падзей, якія тады адбываліся ў Імперыі. Голад, эпідэміі і вайна, фронт якой праходзіў амаль праз кожную вёску і мястэчка, учынілі спусташэнне таксама сярод бежанцаў. Большасць уцекачоў вырашыла тады вяртацца на Бацькаўшчыну. Вандроўка на захад, праз ахопленую пажарам вайны Расію, трывала часам некалькі месяцаў. Ад голаду і хвароб ды па іншых прычынах у апошні перыяд пабыўкі ў Расіі загінуў амаль кожны трэці бежанец»*, – напісаў у прадмове Я. Мірановіч.

Бежанства 1915 года – трагічная старонка беларускай гісторыі, яно знішчыла мільёны беларусаў. У кнізе запісаныя рэальныя ўспаміны людзей, якія перажылі бежанства, успаміны дзяцей і ўнукаў тых, хто пабываў у бежанстве. У беларускіх сем'ях да сёння памятаюць расказы дзядоў і прадзедаў. З аповедаў людзей бачныя рэальныя малюнкі тых падзеяў: калоны вазоў на ўсіх дарогах, якія вядуць на ўсход. Выгнанцы і ўцекачы сціскаюцца паміж воінамі расійскай арміі, якія адыходзяць у спешцы і спіхваюць бежанцаў у абочыны. Стаіць гарачае лета 1915 года. Не хапае вады. Студні па дарозе пустыя. Людзі п'юць ваду ў вадаёмах. Успыхваюць эпідэміі брушнога тыфу, дызентэрыі, халеры. Паміраюць у першую чаргу дзеці. Каля дарог з'яўляюцца тысячы магілаў...

Потым – доўгае вяртанне дамоў. Прыгадвае жыхар Сухавольцаў: *«Вярталіся з сумам у сэрцы і трывожнымі думкамі, што нас чакае на Бацькаўшчыне пасля пяцігадовага бадзяння па чужыне. Што з домам? З бежанства не вярнуўся самы малодшы брацік Васілёк. Пакінулі яго адзінокага ў Бальшым Пірагове. На адзёр памёр. На бацькоўскім пляцы адны руіны засталі. Дом разбураны. Гаспадарчыя будынкі часткова разабраны. Усё патрабавала аднаўлення і грошай. Але адкуль іх узяць? Поле пустазеллем парасло. Ані кароўкі, ані каня не маем. Вярнуліся мы на гэтую пустэчу ў жніўні 1920 года...»*.

Тыя, хто вярнуўся пасля кастрычніцкага перавароту ў Расіі, трапілі ўжо ў новую дзяржаву – Польшчу. Людзі не ведалі мовы, вёскі былі спаленыя, а жыць трэба было. Яны капалі зямлянкі, апрацоўвалі зямлю і паціху пачыналі будаваць новае жыццё.



*Гаўрыіл Купрыяновіч (другі злева) у аўстрыйскім палоне*

***У кнізе «Бежанства 1915 года» вельмі шмат рэдкіх фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць жыццё беларусаў у пачатку XX стагоддзя. Змешчаныя і дадаткі да кнігі. Яны вельмі цікавыя і з'яўляюцца сапраўднымі сведкамі тых падзеяў. Гэта, напрыклад, вопіс маёмасці жыхароў Беласточчыны 1915 года, гэта розныя даведкі, пасведчанні, пісьмы сваякоў з усіх куткоў свету, якія пісалі адно да аднаго, нават пісьмы ад тых беларусаў, якія напярэдадні Першай сусветнай вайны трапілі ў Амерыку і пісалі да сваіх братоў і сясцёр, гэта дазволы на выезды, а таксама вытрымкі з кнігі «Беженцы в Томской губернии: список семейств беженцев и адреса их» (Томск, 1916. Выпускі 1 і 2).***

***Вельмі дарэчы ў кнізе і геаграфічны паказальнік, дзе пазначаныя маёнткі, пасёлкі, гарады, прыстані, рэкі, станіцы, хутары, чыгуначныя станцыі, праз якія прайшлі і праехалі беларускія бежанцы сто гадоў таму.***

Сяргей ЧЫГРЫН

## Іх карані ў Беларусі




**Уздоўж**

**3**. Горад на Брэстчыне, адкуль родам бацькі амерыканскага фізіка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Марціна Перла. **8**. Буйны почырк старажытных лацінскіх, грэчаскіх і славяна-рускіх рукапісаў. **9**. Кароткі літаратурны твор з павучальнай канцоўкай. **10**. ... Фрыдман. Імя амерыканскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата, бацькі якога – ураджэнцы Беларусі. **13**. Беларуская багіня ўрадлівасці і апякунка шлюбаў. **14**. Усходнееўрапейская краіна, у якой нарадзіўся амерыканскі мікрабіёлаг і біяхімік, нобелеўскі лаўрэат Зэльман Ваксман; бацькі яго былі ўраджэнцамі Беларусі. **15**. Сталіца адной з каўказскіх краінаў, родны куток расійскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата Льва Ландау. **18**. Менахем .... Буйны палітычны і грамадскі дзеяч Ізраіля, лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне міру, ураджэнец Брэста. **19**. Буйны беларускі горад, родны кут бацькі амерыканскага фізіка, аднаго з стваральнікаў атамнай бомбы, нобелеўскага лаўрэата Рычарда Фейнмана. **21**. ... Хігер. Імя амерыканскага хіміка, нобелеўскага лаўрэата, бацькі якога нарадзіліся ў Беларусі. **22**. ... Эйнштэйн. Імя геніяльнага вучонага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, аднаго з заснавальнікаў тэарэтычнай фізікі. **25**. Па саломе ... не пазнаеш (прык.). **27**. Населены пункт у сельскай мясцовасці. **29**. ... Перскі. Сапраўднае імя і прозвішча лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне міру, 9-га прэзідэнта Ізраіля Шымона Пераса, які нарадзіўся ў в. Вішнева, што на Валожыншчыне. **30**. Васіль .... Народны пісьменнік Беларусі, што, як і Алесь Адамовіч, аказаў вялікі ўплыў на творчасць першага беларускага лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч. **31**. Месяц, у якім адбываецца ўрачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі.

**Упоперак**

**1**. Янка .... Народны паэт Беларусі, які быў добра знаёмы з маці фізіка, расійскага лаўрэата Нобелеўскай прэміі Жарэса Алфёрава, ураджэнца Віцебска. **2**. «... second-hand». Назва адной з апошніх кніг С. Алексіевіч, бацька якой, беларус Аляксандр, быў асабіста знаёмы з Якубам Коласам. **4**. Ядомы грыб. **5**. Рака ў Беларусі. **6**. «... Валадыеўскі». Раман польскага пісьменніка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры, які працаваў над раманам, таксама як і над раманам «Патоп», у в. Дубнікі, што на Астравеччыне; маці пісьменніка Стэфанія паходзіла з беларускай шляхты, бацька Іосіф – з татараў, якія аселі ў ВКЛ пры вялікім князе Вітаўце. **7**. Горад на Магілёўшчыне, родны кут бацькоў амерыканскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата Шэлдана Глэшоу, а ў Магілёве нарадзіўся бацька расійскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата Іллі Прыгожына Раман Прыгожын. **11**. Тое, што і равеснік. **12**. Кожная пазіцыя пры прысуджэнні ганаровага звання або прызоў. **16**. Горад на Брэстчыне, дзе нарадзіўся амерыканскі эканаміст, нобелеўскі лаўрэат Сайман Кузнец; у гэтым жа горадзе і радавыя карані амерыканскага фізіка, нобелеўскага лаўрэата Фрэдэрыка Райнеса. **17**. Іцхак .... Прозвішча выдатнага дзяржаўнага дзеяча Ізраіля, нобелеўскага лаўрэата, які нарадзіўся ў мястэчку Ружаны, што на Брэстчыне. **18**. «... родная мая». Назва раздзела з кнігі Ж. Алфёрава «Навука і грамадкасць». **20**. Драўляная пасудзіна, выдзеўбаная з тоўстай калоды. **23**. Той, хто любіць паласавацца. **24**. Іцхак .... Прозвішча вядомага ізраільскага дзяржаўнага дзеяча, лаўрэата Нобелеўскай прэміі за мір, маці якога Роза нарадзілася ў Магілёве. **26**. Доля. **28**. Шырокая прастора.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

## Студзень

**17 – Барташэвіч Юльян** (1821, Польшча – 1870), польскі гісторык, літаратуразнаўца, які ў сваіх працах даў звесткі пра старажытную беларускую літаратуру, – 195 гадоў з дня нараджэння.

**17 – Мацкевіч Мікалай Пятровіч** (1941, Зэльвенскі р-н), рэжысёр, заснавальнік і першы мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра (Маладзечна), заслужаны работнік культуры Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**17 – Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі** (Мінск; 1926), скліканы па ініцыятыве гісторыка-археалагічнай камісіі Інстытута беларускай культуры, – 90 гадоў з пачатку правядзення.

**17 – Станкевіч Сяргей Леанідавіч** (1961, Слуцк), танцоўшчык, заслужаны артыст Беларусі – 55 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Сёмуха Васіль Сяргеевіч** (1936, Пружанскі р-н), перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1992) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Іаан Рыжскі** (свецк. **Помер Іаан**; 1876, Латвія – 1934), свяшчэннамучанік Рускай, Беларускай і Сербскай Праваслаўнай Царквы, епіскап Слуцкі, архіепіскап Рыжскі і Латвійскі, першы праваслаўны святы Латвіі – 140 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Паплаўская Наталля Мікалаеўна** (1931, Расія), графік, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970) – 85 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Віктар Сянкевіч** (**Сянькевіч**; 1926, Глыбоцкі р-н), вучоны-гісторык, журналіст, адзін з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі, дзеяч беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі, Іспаніі, Канадзе і ЗША – 90 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Салаўёў Валянцін Мікалаевіч** (1956, Стоўбцы), акцёр, заслужаны артыст Беларусі, лаўрэат тэатральнай прэміі імя В. Дуніна-Марцінкевіча і прыза «Натхненне» (2008) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Тарасаў Сяргей Васільевіч** (1961, Мінск), вучоны-археолаг і гісторык, аўтар даследаванняў па археалогіі і гісторыі беларускіх гарадоў IX – XVIII стст. – 55 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Бажэнаў Віктар Пятровіч** (1941, Узбекістан), артыст аперэты, заслужаны артыст Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Галаванаў Мікалай Сямёнавіч** (1891, Расія – 1953), рускі дырыжор, кампазітар, які аказаў вялікую дапамогу Дзяржаўнаму тэатру оперы і балета Беларусі, народны артыст СССР (1948), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, 1949, 1950, 1951) – 125 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Князева Марыя Браніславаўна** (1956, Мінск), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, жывапісец – 60 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Туранкоў Аляксей Яўлампьевіч** (1886, Расія – 1958), кампазітар, адзін з заснавальнікаў прафесійнай музычнай творчасці ў беларускай музыцы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Халшчанкова Ганна Станіславаўна** (1951, Лідскі р-н), спявачка, заслужаная артыстка Беларусі – 65 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Александровіч Андрэй Іванавіч** (1906, Мінск – 1963), паэт, адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк», член-карэспандэнт НАН Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Ізяслаў** (свецк. **Бруцкі Іван**; 1926, Столінскі р-н – 2007), рэлігійны і грамадскі дзеяч беларускага замежжа (Канада, ЗША), іерарх Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы – 90 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Зінкевіч Уладзімір Леанідавіч** (1951, Хойніцкі р-н), жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2008), узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны (2011) – 65 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Міхась Мушынскі** (Міхаіл Іосіфавіч; 1931, Быхаўскі р-н), літаратуразнаўца, тэкстолаг, крытык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1980) – 85 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Міхась Пазнякоў** (Міхаіл Паўлавіч; 1951, Быхаўскі р-н), пісьменнік, перакладчык, мовазнаўца, журналіст, член-карэспандэнт Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (Санкт-Пецярбург, 2015) – 65 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Філіпаў Раман Сяргеевіч** (1936, Украіна – 1992), беларускі і расійскі акцёр, заслужаны артыст Беларусі, народны артыст Расіі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Герашчанка Дзмітрый Васілевіч** (1951, Мінск), архітэктар, па праектах якога пабудаваныя паркі і водаахоўныя зоны многіх беларускіх гарадоў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1989) – 65 гадоў з дня нараджэння.

*Творчасць нашых чытачоў*

## Вершы магутнага чалавека




На цікавыя сустрэчы ў рэдакцыі «Краязнаўчай газеты» мы не абдзеленыя. Вось і яшчэ адна: з незвычайным беларусам Вячаславам Назаранкам, чэмпіёнам па нязвыклым для нас відзе спорту – кітайскім боксе з элементамі барацьбы, ці не «у-шу». Адным словам, магутны чалавек. Да таго ж, піша вершы – па-руску, але, можна сказаць, з глыбокім патрыятычным ухілам у беларушчыну. Яго вершы чыталі многія, у тым ліку доктар мастацтвазнаўства А. Смагін, паэты Я. Еўтушэнка, Т. Бондар. Чытаў іх і я.

Грамадства і школа адпрэчылі чалавека ад яго роднага беларускага слова. А ён колькі мог і як мог змагаўся, інтуітыўна адчуваючы сябе сынам гэтай зямлі. У якія б краі не закідваў яго лёс (Літва, Германія, Комі, Нагорны Карабах), ён заўсёды вяртаўся дадому. Першую сваю паэтычную кніжачку выдаў на рускай мове, але як глыбінна адчуў сваё, роднае – вы зразумееце, прачытаўшы хаця б адзін верш з яе.

*Уладзімір ГІЛЕП*

### Пятница, год тридцать третий

*Было – не было,*
*В жизни оставленной*
*Превращается время в золу,*
*На земле меч Петра*
*окровавленный,*
*На Христе серебром поцелуй.*

*А толпа в безрассудстве,*
*безропотно*
*Принимавшая плеть и ремни,*
*Повторяет то криком,*
*то шёпотом*
*Сатанинское слово «распни!».*

*В стороне, пряча страх*
*неизведанный,*
*Видно, верить всерьёз не с руки,*
*До недавнего времени преданные*
*И предавшие ученики.*

*И вошёл на Христовом*
*распятии*
*В тело белое чёрный металл.*
*Так сошлись во вселенском*
*заклятии*
*Свет небесный и Сарданапал.*

*В ремесле палача*
*нет излишнего.*
*И ещё не взошёл Благовест,*
*И, держащий гвоздями*
*Всевышнего,*
*В землю грешную вкопан крест.*

*Под крестом острым*
*камнем дорога.*
*Так решила духовная знать:*
*Во-вторых чтобы приняли Бога,*
*Надо Бога во-первых распять.*

*В освящённом зарёю знамении*
*Багровеет заката канва.*
*Пало ливнем на землю прощение*
*Триединого Божества.*

### Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 1

***Уздоўж***: **1**. Два. **2**. Завуголле. **8**. Кадр. **9**. Азіміна. **10**. Адзін. **13**. Збожжа. **14**. Абза. **18**. Кулік. **19**. Абозы. **20**. Апал. **21**. Талака. **23**. Азарт. **27**. Беларус. **28**. Клоп. **30**. Бурт. **31**. Прачыстая. **32**. Ніз.
***Упоперак***: **1**. Дзяжа. **3**. Апад. **4**. Гумно. **5**. Луара. **6**. Рай. **7**. Прываркі. **11**. Замова. **12**. Нарыс. **15**. Бульба. **16**. Скіба. **17**. Барацьба. **21**. Табар. **22**. Араты. **24**. Тапаз. **25**. Ясна. **26**. Тры. **29.** Лён.

## Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**НО́ВЫ ГО́Д** – (*заканчэнне артыкула*).Раніцай новага года спраўлялі абрад засявання. Яго выконвалі дзеці. Яны хадзілі з торбаю, напоўненай зернем, па вёсцы, заходзілі ў хаты, віталі гаспадароў і імітавалі сяўбу: пасыпалі падлогу зернем жыта, пшаніцы, аўса, ячменю. Рабілі гэта моўчкі або суправаджалі сімвалічнае дзеянне кароткай песняй, у якой жадалі гаспадарам ураджаю, дабрабыту ў новым годзе. Выканаўцам давалі святочныя падарункі. Састаўной часткай зімовага навагодняга свята была ўрачыстая абрадавая вячэра, якую наладжвала кожная сям'я напярэдадні. Абавязковай абрадавай стравай была куцця, таму і сама вячэра называлася «куцця». Яе называлі таксама багатай, шчодрай, мясной, тоўстай куццёй. На вячэру гаспадары імкнуліся нагатаваць як мага больш і самых лепшых страваў, што сімвалізавала багацце, дастатак, дабрабыт.

Напярэдадні Новага года была пашыраная варажба. Варажылі пераважна дзяўчаты. Знаёмству іх з хлопцамі садзейнічалі ігрышчы, што адбываліся ў пачатку новага года. На поўначы Беларусі характэрнай навагодняй гульнёй была «Жаніцьба Цярэшкі», на захадзе – «Яшчур». У капіталістычную эпоху ў Беларусі, найперш у гарадах, распаўсюдзіўся звычай ставіць навагоднюю елку (прычым, рабілі гэта загадзя, яшчэ да Нараджэння Хрыстова). Спачатку яе надзялялі звышнатуральнымі ўласцівасцямі, пакланяліся ёй. Упрыгожванне елкі было абрадам ахвярапрынашэння, уміласціўлення. Гэтак імкнуліся ўлагодзіць, задобрыць дрэва, яго жыццёвую сілу, якая нібыта магла садзейнічаць чалавеку, урадлівасці поля, дабрабыту сям'і. Паступова рэлігійны сэнс абрадаў пачаў знікаць. Зялёная ўпрыгожаная елка пачала сімвалізаваць жыццё, здароўе, шчасце. Важнае значэнне набылі эстэтычныя рысы святочнага навагодняга дрэва, якое выклікае радасць, добрыя надзеі. Упрыгожаная елка паступова ператварылася ў галоўны сімвал навагодняга святкавання. Адбыліся пэўныя змены і ў складзе навагодніх масак-персанажаў: з'явіліся Дзед Мароз, Снягурка. Новыя элементы навагодняга свята ў гэты перыяд былі характэрныя толькі для побыту багатых. Яны яшчэ не распаўсюдзіліся сярод большай часткі беларускага этнасу, у прыватнасці, сялянаў, рамеснікаў, рабочых.

Значныя змены ў комплексе навагодніх абрадаў і звычаяў адбыліся цягам XX ст. Большасць з іх страціла свой магічны сэнс і ператварылася ў гульню, забаву. Новы год стаў папулярным народным святам. Напярэдадні яго арганізоўваюцца перадnавагоднія гандлёвыя кірмашы, елачныя базары. Магазіны ды іншыя гандлёвыя прадпрыемствы абвяшчаюць зніжкі і распродажы, ілюмінуюцца гарады і многія вёскі. Упрыгожаныя навагоднія елкі ўсталёўваюцца ў кватэрах гараджанаў і хатах сялянаў, на плошчах, у культурна-асветных установах. У палацах, дамах культуры, клубах, садках, школах, бібліятэках праводзяцца навагоднія балі, маскарады, у якіх удзельнічае ў асноўным моладзь, у школах і садках – дзеці; у канцэртных залах, тэатрах і цырках адбываюцца навагоднія канцэрты і паказы. На плошчах і вуліцах арганізоўваюцца народныя гулянні і тэатралізаваныя прадстаўленні з удзелам казачных персанажаў і літаратурных герояў (Дзед Мароз, Снягурка, Стары год, Новы год і інш.). Апошнія дзесяцігоддзі робяцца спробы ўзнавіць навагоднія шчадроўкі. Новы год стаў любімым і жаданым святам для дзяцей. Вакол елкі яны водзяць карагоды, спяваюць песні, тут атрымліваюць навагоднія падарункі.

Абавязковы элемент навагодняй урачыстасці – звычай віншаваць родных, сяброў, знаёмых, калегаў па працы, рабіць падарункі. У апошнія хвіліны старога года па радыё і тэлебачанні транслюецца навагодняе віншаванне кіраўніка дзяржавы. Навагоднія застоллі суправаджаюцца абменам падарункамі, песнямі, танцамі, праглядам тэлепраграмаў. Многія ўначы выходзяць гуляць да святочнай елкі, на вуліцы і двары. У першы дзень новага года ў гарадах і вёсках арганізоўваюць культурна-масавыя мерапрыемствы. Для дзяцей навагоднія мерапрыемствы праходзяць і ў наступныя дні да Вадохрышча.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 14.01.2016
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 26.
Тыраж 800 асобнікаў.